УДК 94:322(47+57)«192/193»:32.019.5

*Н. І. Казлова*

# НАЦЫЯНАЛЬНЫ АСПЕКТ АНТЫРЭЛІГІЙНАЙ ПРАПАГАНДЫ Ў СССР У КАНЦЫ 1920-Х–1930-Я ГАДЫ

*Артыкул прысвечаны тэме антырэлігійнай прапаганды ў нацыянальных рэспубліках савецкай дзяржавы ў канцы 1920-х – 1930-я г. Даследаванне грунтуецца на матэрыялах антырэлігійнага перыядычнага друку разглядаемага перыяду. У артыкуле разгледжаны антырэлігійныя прапагандысцкія мерапрыемствы, ступень іх эфектыўнасці і распаўсюджанасці. Таксама разгледжаны адносіны нацыянальных меншасцей СССР да антырэлігійных акцый. На аснове дадзенага даследавання аўтар прыходзіць да высновы, што антырэлігійная прапагандысцкая дзейнасць савецкай улады ў адносінах да нацыянальных рэлігій не была дастаткова эфектыўнай, аб чым сведчыць высокі ўзровень рэлігійнасці нацыянальных меншасцей СССР.*

Ва ўмовах нацыянальных рэспублік і абласцей працэс усталявання савецкай улады быў цесна звязаны з барацьбой супраць рэлігійных арганізацый. Адным з метадаў такой барацьбы з'яўлялася антырэлігійная прапаганда, якая пачала разгортвацца ў сярэдзіне 1926 г. Да гэтага часу Саюз бязбожнікаў, які быў створаны ў 1925 г., вёў працу "разведвальнага" характару. І з'езд СБ толькі паставіў пытанне аб неабходнасці разгарнуць антырэлігійную працу сярод нацыянальнасцей.

Мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца разгляд працэсу арганізацыі антырэлігійнай прапагандысцкай дзейнасці ў канцы 1920–1930-я гг. у нацыянальных рэспубліках СССР. Даследаванне грунтуецца на матэрыялах антырэлігійнага перыядычнага друку разглядаемага перыяду, а менавіта часопісах "Безбожник у станка" і "Антирелигиозник", газеце "Безбожник".

Трэба адзначыць, што пачынаючы з 1929 г. пад націскам апынуліся ўсе рэлігійныя плыні, нават уключаючы тыя, у адносінах да якіх дапускаліся паслабленні. Так, з 1929 па 1931 г. актывісты бязбожнага руху займаліся распрацоўкай пытанняў уліку нацыянальных асаблівасцей. Распрацаваўшы гэтыя пытанні, савецкае кіраўніцтва прыступіла да правядзення антырэлігійных мерапрыемстваў у нацыянальных раёнах СССР так: "каб масы пераканаліся і ўсвядомілі, што рэлігія спрыяе захаванню тых адносін, якія мяшаюць ім рухацца па шляху калектывізацыі такімі тэмпамі, якімі ідуць іншыя вобласці" [1].

Антырэлігійны друк у канцы 1920-х пачатку 1930-х гадоў шмат пісаў аб поспехах у змаганні з нацыянальнымі рэлігіямі. Адзначалася, напрыклад, што калі на І з'ездзе СБ прысутнічалі прадстаўнікі толькі 6 нацыянальнасцей СССР, то на ІІ з'ездзе бязбожнікаў былі прадстаўлены ўжо 37, а на ІІІ пленуме ЦС СВБ у 1931 годзе было

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

ўжо 47 нацыянальнасцей Савецкага Саюзу, сярод якіх былі курды, каракі, чачэнцы, інгушы, карэйцы і інш.” [5, с. 99]. На гэтым пленуме, а таксама на антырэлігійнай нарадзе па кадрах, па працы сярод жанчын, на ўсесаюзнай нарадзе антырэлігійных аддзяленняў навукова-даследчых устаноў, скліканай Камакадэміяй у 1930 г., быў прыняты шэраг важных рашэнняў па бязбожнай працы сярод нацыянальнасцей.

Да 1932 года былі выдадзены антырэлігійныя падручнікі на 22 мовах; на 14 мовах выходзілі антырэлігійныя газеты і часопісы [1]. М. У. Кабецкі, які адказваў у ЦС СВБ за антырэлігійную працу сярод нацыянальнасцей, пісаў, што поспехі сацыялістычнага будавання – завяршэнне стварэння падмурка сацыялістычнай эканомікі, датэрміновае выкананне плана першай пяцігодкі, сацыялістычныя ператварэнні ў сельскай гаспадарцы і інш. выклікалі радыкальныя перамены ў свядомасці рабочых і стварылі спрыяльныя ўмовы для разгортвання паглыбленай антырэлігійнай прапаганды.

Атэізм, сцвярджаў ён, расце і ў паўночнай тундры, і ў пясках Сярэдняй Азіі, і каля горных вяршынь Каўказа, і на берагах Паўночнага акіяна: скарачаецца колькасць мячэцей, сінагог, касцёлаў, кірхаў, дацанаў і іншых малітвеных будынкаў і змяншаецца іх наведвальнасць, цалкам упаў аўтарытэт рэлігійных школ, змяншаецца святкаванне рэлігійных святаў і выкананне рэлігійных абрадаў, значнае паслабленне аўтарытэта “рэлігійнай” медыцыны; жыхары кішлакоў і аулаў выступаюць з адкрытымі публічнымі заявамі пра свой адыход ад рэлігіі. Адзначалася, што змены адбыліся і ў становішчы жанчын: “робіцца ўсё для таго, каб жанчына змагла фактычна скарыстаць сваё права”. Так, былі адкрыты курсы для падрыхтоўкі жанчын да працы, у якасці настаўніц, медычных работніц, дашкольніц, работніц розных спецыяльнасцей. “Многія цюрчанкі і ўзбечкі, якія не мелі некалі магчымасці выходзіць з хаты без дазволу бацькоў і мужоў, зараз ужо скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы… Расце колькасць жанчын, якія знялі паранджу і чадру” [10, с. 256].

Аднак аўтары многіх публікацый давалі больш стрыманыя, асцярожныя ацэнкі поспехаў нацыянальнай бязбожнасці ў СССР. С. Урсыновіч у артыкуле “Рэлігійныя арганізацыі Савецкага Ўсходу” пісаў: “Антырэлігійнае змаганне з шаманствам у розных частках Сібіры і ДВК... у многіх месцах моцна кульгае і нават адсутнічае. Некаторую планамернасць, зрэшты, надае (ці, мабыць, правільней было б сказаць імкнецца надаць) Паўночны камітэт, які адправіў у асобныя свае культбазы, напрыклад, да эвенак (тунгусам) на Енісей, антырэлігійных працаўнікоў” [4, с. 47].

Характарызуючы антырэлігійны рух у рэспубліках з мусульманскім насельніцтвам, Урсыновіч адзначаў, што ў розных рэгіёнах яно мае розны ўзровень развіцця. Найвялікшых поспехаў дасягнула Татарская рэспубліка, дзе выдаюцца антырэлігійныя часопісы, існуюць ячэйкі СВБ, а многія мячэці пераўтвораны ў культурна-асветніцкія ўстановы. Сярод крымскіх жа татар гэты рух больш слабей, а “ў большасці рэспублік Каўказа, у Туркестанскіх рэспубліках ён толькі разгортваецца” [4, с. 54].

Хоць у літаратуры і перыёдыцы таго часу дамінавала тэндэнцыя да завышэння вынікаў бязбожнай працы, у ёй усё ж можна знайсці інфармацыю, што паказвае рэальнае становішча справаў у рэгіёнах. Такія, напрыклад, матэрыялы Ўсесаюзнай канферэнцыі педагогаў-бязбожнікаў, якая прайшла ў Маскве ў жніўні 1931 года. Настаўнікі, якія ўдзельнічалі ў гэтай канферэнцыі, казалі аб тым, што ў рэспубліках бязбожныя гурткі па большай частцы існуюць фармальна, на паперы, і ніякага антырэлігійнага выхавання не вядзецца [6].

Настаўнік Мартэн з Інгушэціі расказваў, што рэлігійнасць насельніцтва ў рэспубліцы вельмі высокая і многія камуністы і камсамольцы ходзяць у мячэць. “Уплыў духавенства настолькі моцны, што некаторыя дзеці не згаджаюцца займацца па кнігах, якія маюць антырэлігійны характар. Да настаўнікаў, якія спрабуюць весці прапаганду, яны ставяцца варожа, і такім настаўнікам нярэдка даводзіцца сыходзіць са школы” [6, с. 72]. Іншы ўдзельнік канферэнцыі паведамляў: “У нас у Грузіі няма ніякай

РЭПАЗІТОРЫЙ ГДУ ІМЯ Ф. СКАРЫНЫ

планавай працы; Ні камсамол, ні іншыя арганізацыі ў планавым парадку гэтай працай не займаюцца, і пра існаванне ячэек СВБ у нас нічога не вядома” [6, с. 74].

У 1930 годзе “Безбожник у станка” апублікаваў кур’ёзную заметку аб тым, што НКУС Дагестана даслаў запрос у дагестанскі Саюз бязбожнікаў, патрабуючы паведаміць, якую арганізацыю ён прадстаўляе, рэлігійную ці навуковую [3, с. 7].

У 1933 г. у адным з артыкулаў часопісу “Антирелигиозник” паведамлялася аб антырэлігійнай працы ў нацвёсцы савецкай дзяржавы. Так, было адзначана, што ніякай шырокай, сістэматычнай антырэлігійнай працы не праводзіцца, што звязана з непадрыхтаванасцю антырэлігійных кадраў, недахопам адпаведнай літаратуры і т. п. [7, с. 33].

У публікацыях і выступах самога М. Кабецкага таксама можна знайсці інфармацыю, якая знаходзіцца ў яўным дысанансе з агульным тонам яго пераможных рапартаў. У адным з артыкулаў у газеце “Безбожник” ён расказаў, напрыклад, пра абследаванне антырэлігійнай працы на Паўночным Каўказе, праведзеным брыгадай ЦС СВБ у 1930 годзе. Абследаванне паказала пасіўнасць мясцовай моладзі, яе нежаданне праяўляць сваю бязбожнасць [2].

На курсах маладых актывістак для аула 85% навучэнцаў былі веруючымі. Навучэнцы настаўніцкіх курсаў у Чачні адзінадушна выказаліся супраць правядзення антырэлігійнай прапаганды, а адзін з іх заявіў, што “антырэлігійную прапаганду ў Чачні трэба пачынаць тады, калі памрэ апошні мусульманін”. “У адным з калгасаў, якія ахапляюць 85 працэнтаў гаспадарак (у Адыгеі), у жніўні 1930 г. у хаце-чытальні, дзе сабраліся старыя і моладзь (сярод іх камсамольцы і ўдзельнікі ячэйкі СВБ), на маё пытанне “ці ёсць сярод прысутных тыя, хто ня верыць у бога” – ніхто не адказаў. Бязбожнікі змаўчалі. Адзін з маладых хлопцаў пасля агульнага маўчання стаў даказваць неабходнасць веры ў Бога, і зноў ніхто з прысутных яму не запярэчыў” [2, с. 22-23].

Ужо гэтыя факты паказваюць, што надзеі І. Скварцова-Сцяпанава на тое, што змагацца з ісламам будзе гэтак жа лёгка, як з праваслаўем, былі наіўныя і неажыццявімыя. Нават у 1938 годзе палова жанчын, якія працавалі на шоўкаматальнай фабрыцы ў Ленінабадзе, сталіцы Таджыкістана, насілі паранджу [8, с. 23].

Пасля перыяду павышанай актыўнасці на мяжы 1920-1930-х гадоў дзейнасць “нацыянал-антырэлігіёзнікаў” стала слабець. Дакладнай статыстыкі па гэтым пытанні няма, але можна ўпэўнена сцвярджаць, што ячэйкі і гурткі бязбожнікаў у рэспубліках разбураліся яшчэ хутчэй, чым у рускамоўных рэгіёнах. Часопіс “Антырэлигиозник” пісаў пра стан антырэлігійнай працы ў Туркменіі ў 1940 годзе: “У многіх раёнах рэспублікі не было саветаў СВБ, не было амаль ніякай працы. Гэта праца вялася амаль толькі ў гарадах, але і там вельмі дрэнна, па-кампанейску, пры нізкім узроўні якасці...” [9, с. 55].

Да сярэдзіны 1930-х гадоў у СССР былі ліквідаваны амаль усе нацыянальныя антырэлігійныя газеты і часопісы. У 1941 годзе выходзілі толькі газета “Безбожник” на ўкраінскай мове (Кіеў), часопіс “Ваяўнічы атэіст” на грузінскай мове (Тбілісі), часопіс “Атэіст” на эстонскай мове (Талін) і часопіс “Вольная думка” на літоўскай мове (Каўнас). Апошнія два выданні з’явіліся пасля далучэння да СССР у 1940 годзе прыбалтыйскіх рэспублік: Латвіі, Літвы і Эстоніі [1].

У перыяд “вялікага тэрору” нацыянальныя антырэлігійныя кадры падпадалі чысткам і рэпрэсіям. Так, напрыклад, па абвінавачванні ў прыналежнасці да “султангаліеўшчыны” ў 1937 годзе быў асуджаны і ў хуткім часе расстраляны Б. Х. Мансураў – кіраўнік Татарскага Саюзу ваяўнічых бязбожнікаў, адказны рэдактар часопіса “Сугышчан алласыз”. Быў расстраляны і М.У. Кабецкі, які адказваў у ЦС СВБ за антырэлігійную працу сярод нацыянальнасцей.

Аналізуючы матэрыялы атэістычнай перыёдыкі па антырэлігійнай працы сярод нацыянальнасцей СССР, можна адзначыць, што да канца 1930-х гг. большасць мерапрыемстваў антырэлігійнага характару мелі даволі спрэчныя вынікі. Спыненне

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

дзейнасці рэлігійных арганізацый, зачыненне малітвеных дамоў не пацягнулі за сабой поўнай адмовы насельніцтва ад рэлігіі. Як вынік, захаванне рэлігійнасці насельніцтва, а таксама адсутнасць кваліфікаваных кадраў, належнага кіраўніцтва атэістычнай прапагандай рабілі метады працы недастаткова эфектыўнымі. Не выпадкова, менавіта ў гэты перыяд з боку ўлады пачынаецца перагляд адносін да рэлігіі ў рамках палітыкі рэлігійнай цярпімасці.

**Літаратура**


1 Лучшев, Е. М. Антирелигиозная пропаганда в СССР: 1917–1941 гг. [Электронны рэсурс] / Е. М. Лучшев. – СПб. : Информационно-техническое агентство Ритм, 2016. – 364 с. – Рэжым доступу: http://www.twirpx.com/file/2173645/. – Дата доступу: 02.05.2018.

2 Кобецкий, М. Комсомол советского Востока иа антирелигиозном фронте / М. Кобецкий // Безбожник. – 1931. – №7. – С. 22–23.

3 В.Т. Кто они? // Безбожник у станка. – 1930. – № 3. – 7 с.

4 Урсынович, С. Религиозные организации Советского Востока / С. Урсынович // Безбожник у станка. – 1933. – №9. – С. 8–13.

5 Олещук, Ф. Антирелигиозную работу на новую ступень / Ф. Олещук // Антирелигиозник – 1931. –№6. – С. 98–101.

6 Стенограммы II Всесоюзной конференции педагогов-безбожников // Антирелигиозник. – 1931. – №11. – С. 72–75.

7 Антирелигиозная работа среди национальностей // Антирелигиозник. – 1933. – №3. – С. 32–35.

8 Об очередных задачах антирелигиозной пропаганды среди национальностей // Антирелигиозник. – 1938. – № 8-9. – С. 23–26.

9 Дьяков, А. Из опыта укрепления Туркменской организации СВБ / А. Дьяков // Антирелигиозник. –1941. – № 2. – С. 55–56.

10 Кобецкий, М. Безбожие среди национальностей СССР / М. Кобецкий // Воинствующее безбожие в СССР за 15 лет. 1917-1932. под ред. М. Енишерлова, А. Лукачев- ского, М. Митина. – М. : ОГИЗ-ГАИЗ, 1932. – С. 250–267.


РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ